АЛЯКСАНДР ВАБІШЧЭВІЧ

# Асвета на Палессі ў 1921—1939 гг.: паміж спадзяваннямі і рэаліямі

Пасля Рыжскага міру 1921 г. разам з іншымі заходнебеларускімі землямі ў склад польскай дзяржавы была ўключана і заходняя частка Палесся. Уключаная ў створанае Палескае ваяводства, яна з'яўлялася ў той час адсталым аграрным рэгіёнам. Край панёс немалыя матэрыяльныя і людскія страты спачатку ў гады Першай сусветнай вайны, а пасля падчас савецка-польскага ваеннага супрацьстаяння. Акрамя таго, гэтыя землі вылучаліся слабым узроўнем цывілізацыйнага развіцця яшчэ ў дарэвалюцыйнай Расійскай імперыі. На Палессі да ўключэння яго ў склад міжваеннай Польшчы Праваслаўная царква і школа няшмат зрабілі ў галіне культуры, слаба ўплываючы на светапогляд мясцовых вяскоўцаў[1].

---

**Аляксандр Вабішчэвіч** — гісторык, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Даследуе праблематыку нацыянальна-культурнага развіцця заходнебеларускіх земляў паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі, гісторыю культуры Беларусі XX ст., пытанні гістарычнага краязнаўства. Аўтар дзвюх манаграфій, апошняя з якіх — «Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.)» (Брэст, 2008).

Непісьменнасць з'яўлялася тут адной з вострых сацыяльных праблем. З усіх заходнебеларускіх земляў у Палескім ваяводстве паказчык непісьменных быў самым большым: у 1921 г. агульная непісьменнасць тут складала 71% (у гарадах — 37,7%, у палескіх вёсках — 78,1%). Акрамя таго, адчувалася моцная дыспрапорцыя ў адукацыйным узроўні паміж гарадскім і вясковым насельніцтвам, а таксама назіралася розніца ва ўзроўні адукацыі мужчын і жанчын. Так, у Палескім ваяводстве непісьменнасць мужчын складала 60,6%, а жанчын — 80,6%, у той час як у межах усёй тагачаснай Польшчы, куды ўваходзілі і іншыя заходнебеларускія землі, агульная непісьменнасць складала 33%, толькі 35,7% жанчын не ўмелі чытаць і пісаць[2].

Адсутнічала на Палессі і разгалінаваная сетка школ. Адна пачатковая школа прыходзілася на 125 км$^2$ (самы нізкі паказчык у тагачаснай Польшчы). Нават тыя школы, што існавалі, не адпавядалі элементарным патрабаванням. З-за ваенных разбурэнняў стала складаным іх матэрыяльна-фінансавае становішча. Акрамя таго, востра адчуваўся недахоп настаўніцкіх кадраў. У 1921/22 навучальным годзе ў Палескім ваяводстве толькі 10% настаўнікаў мелі адпаведную кваліфікацыю. Хоць у гэтым навучальным годзе планавалася адкрыць 607 школ, у выніку функцыянавала толькі 356 (разам з прыватнымі), дзе 457 настаўнікаў навучалі 17 400 вучняў. На аднаго настаўніка прыпадала прыкладна 38 дзяцей[3]. Улічваючы такі стан адукацыі на Палессі, на польскія ўлады ўскладалася вялікая адказнасць у справе ліквідацыі там непісьменнасці і малапісьменнасці, а таксама разгортвання сеткі навучальна-выхаваўчых устаноў.

На ўсіх заходнебеларускіх землях школьная сфера пераўтваралася ў дзейсны інструмент ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі польскіх уладаў. У адносінах да няпольскіх школ шырока выкарыстоўваліся паліцэйска-адміністрацыйныя захады. Закрываючы беларускія школы, польскія ўлады спасылаліся быццам на нізкі ўзровень навучальна-выхаваўчага працэсу, недастатковую кваліфікацыю педработнікаў, недахоп беларускамоўных настаўнікаў, слабую матэрыяльную падтрымку з боку насельніцтва і г. д.

[1] Rolecki R. Czudzin wieś powiatu łuninieckiego. Stosunki społeczno-gospodarcze // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Nr 26. Białystok, 2006. S. 191.

[2] Polski stan posiadania na Polesiu. Brześć nad Bugiem, 1939. S. 32; Tomczonek Z. Ruch ludowy na terenie województwa poleskiego w latach 1920—1939 // Białostocczyzna. 1994. № 1. S. 52.

[3] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 59, воп. 8, спр. 146, арк. 8; Rocznik Poleski. Brześć nad Bugiem, 1927.

Закон «Аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў» ад 31 ліпеня 1924 г. ніколькі не паслабіў пазіцыі польскіх школ. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, іх колькасць павялічвалася. У 1925/26 навучальным годзе ў Палескім ваяводстве дзейнічалі 764 дзяржаўныя школы, з іх 753 — польскія[4].

У адукацыйнай палітыцы польскіх уладаў важнае значэнне набывала кадравае пытанне. У навучальныя ўстановы накіроўваліся пераважна настаўнікі-палякі, ураджэнцы заходніх ці паўднёвых рэгіёнаў Польшчы. Па стане на снежань 1926 г. у настаўніцкім корпусе дзяржаўных пачатковых школ Палескай акругі (акрамя Палескага ваяводства, гэтая акруга ўключала таксама Баранавіцкі, Нясвіжскі і Стаўбцоўскі паветы Наваградскага ваяводства) палякі складалі ў асобных паветах ад 86,5% да 98,9%[5].

Насаджэнне польскіх школ не магло не выклікаць негатыўнай рэакцыі няпольскага насельніцтва. Яшчэ ў пачатку 1920-х гг. у асобных мясцовасцях Палесся вясковае насельніцтва адмаўлялася пасылаць дзяцей на вучобу ў польскія пачатковыя школы[6]. Назіраўся пераход ад пасіўных да больш актыўных формаў супрацьдзеяння паланізацыі. Пасля прыняцця згаданага ўжо закона «Аб мове…» ад 31 ліпеня 1924 г. і дадатковага распараджэння міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ад 7 студзеня 1925 г. у Палескім ваяводстве, як і на іншых землях Заходняй Беларусі, таксама абудзіўся рух за адкрыццё беларускіх школ. Ужо да сакавіка 1925 г. бацькі падалі школьным інспектарам 2536 заяў аб навучанні дзяцей па-беларуску[7]. Найбольш такіх дэкларацый падалі жыхары Косаўскага і Пружанскага паветаў. Мясцовая адміністрацыя, аднак, усяляк гэтаму працэсу перашкаджала. У Косаўскім павеце так і не было задаволена жаданне мясцовага насельніцтва аб адкрыцці 22 беларускіх школ. У цэлым з-за моцнага супраціўлення паліцэйска-адміністрацыйнага апарату рэальныя вынікі барацьбы за беларускія школы былі нязначныя. З 1925/26 па 1927/28 навучальны год колькасць дзяржаўных пачатковых школ з беларускай мовай навучання ў Палескай акрузе (пераважна па-за адміністрацыйнымі межамі Палескага ваяводства) павялічылася з 2 да 7, польска-беларускіх — з 6 да 7[8].

[4] Szkoły powszechne Rzeczypospolitej Polskiej w roku szkolnym 1925/26 (Stan z dnia 1 grudnia 1925 roku). Warszawa, 1927. S. LXXXII—LXXXIII.

[5] ДАБВ. Ф. 59, воп. 3, спр. 1196, арк. 481—498.

[6] Rolecki R. Czudzin wieś powiatu łuninieckiego… S. 206.

[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 883, воп. 1, спр. 77, арк. 148—154.

[8] ДАБВ. Ф. 59, воп. 2, спр. 10, арк. 12—1 3; спр. 309, арк. 2—3.

Польскія ўлады фактычна праігнаравалі жаданне няпольскага насельніцтва мець школы на роднай мове. Да 1928/29 навучальнага года на Палессі фактычна адсутнічалі беларускія і ўкраінскія дзяржаўныя пачатковыя школы. Нязначныя наступныя саступкі не змянілі становішча. У 1930/31 навучальным годзе ў Палескім ваяводстве статус дзяржаўных, акрамя польскіх, мелі 1 беларуская і 10 польска-беларускіх пачатковых школ. У 30-ці польскіх школах вывучалася беларуская мова як прадмет, а таксама існавала некалькі польска-ўкраінскіх школ. Аднак да сярэдзіны 1930-х гг. сітуацыя з няпольскай адукацыяй значна пагоршылася — беларускія і ўкраінскія школы зніклі наогул, а польскія навучальныя ўстановы засталіся пануючымі[9].

З усталяваннем у 1926 г. у Польшчы санацыйнага рэжыму Юзафа Пілсудскага ідэалагічныя і палітычныя аспекты ў школьнай палітыцы ўзмацніліся. Аднак ажыццявіць асіміляцыйныя планы на практыцы было не так проста, бо дастаткова вялікага размаху на тэрыторыі Заходняй Беларусі дасягнуў беларускі нацыянальна-вызваленчы рух.

Хоць колькасць школ у Палескім ваяводстве няўхільна павялічвалася (у 1928/29 навучальным годзе было 1 019 школ, дзе вучыліся 92 925 вучняў і працавалі 1 845 настаўнікаў[10]), аднак гэта задавальняла патрэбы рэгіёна не ў поўнай ступені. Павольна разгортвалася сетка навучальных устаноў у «бясшкольных акругах». Толькі ў Брэсцкім павеце ў 1926 г. налічвалася 26 такіх акруг. Падобная сітуацыя была ў Пінскім, Столінскім і Лунінецкім паветах. Значная частка дзяцей сялян была пазбаўлена магчымасці атрымаць нават пачатковую адукацыю. Паводле дадзеных перапісу насельніцтва 1931 г., у Палескім ваяводстве непісьменныя ва ўзросце больш за 10 гадоў складалі 50% насельніцтва[11]. Паводле назіранняў, зробленых Рудольфам Ралецкім у вёсцы Чудзін Лунінецкага павета, сярод тых палешукоў, што заявілі сябе пісьменнымі, былі такія, якія маглі толькі прачытаць некалькі простых сказаў (пераважна на рускай мове), а таксама напісаць уласнае імя і прозвішча. Да тых, хто рэальна піша і чытае, ён залічваў толькі з дзясятак вяскоўцаў:

> *Зацікаўленне кніжкай ці газетамі вельмі слабое. Няма ніводнага гаспадара, які б выпісваў якую газету. Чытаюць толькі тыя,*

[9] Gąsiorowski Z. Szkoła na Polesiu na tle stanu i potrzeb szkolnictwa Rzeczypospolitej. Brześć nad Bugiem, 1930. S. 34.

[10] ДАБВ. Ф. 59, воп. 8, спр. 146а, арк. 8; воп. 1, спр. 314, арк. 45—47.

[11] Drugi powszechny spis ludnosci z dn. 9.12.1931. Polska (dane skrócone) // Statystyka Polski. Ser. C. Z. 62. Warszawa, 1937. S. 46.

*якія ім пастаўляюць агітатары-беларусы з Клецка. Большую цікавасць да кніг і газет праяўляе моладзь…*[12].

Нягледзячы на суб'ектыўны характар такога прыватнага назірання, трэба ўсё ж прызнаць хоць і «сціплыя», але пэўныя станоўчыя поспехі ў змаганні з непісьменнасцю «за польскім часам».

Узмацненню пазіцый польскіх школ на Палессі садзейнічала дзейнасць культурна-асветніцкай арганізацыі «Польска Мацеж Школьна» (*Polska Macierz Szkolna;* ПМШ). Паводле свайго статута, ПМШ магла адкрываць і ўтрымліваць школы розных тыпаў, народныя чытальні, бібліятэкі, арганізоўваць курсы, праводзіць лекцыі, гутаркі, выставы, канферэнцыі і іншыя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, выдаваць і распаўсюджваць навучальную, навуковую і іншую літаратуру[13]. Дзеячы ПМШ лічылі, што

*ў нацыянальнай асіміляцыі палешукоў менавіта кадры палескай інтэлігенцыі, што паходзіць з вёскі і выхаваныя ў яе прымітыўных умовах паўсядзённнага побыту, могуць і павінны выканаць асноўную ролю…*[14].

Таму гурткі ПМШ накіроўвалі сваю працу на ліквідацыю «бясшкольных акруг», аднак адукацыю атрымоўвалі пры гэтым пераважна дзеці асаднікаў і чыноўнікаў. Больш паспяхова гурткі працавалі ў галіне пачатковай адукацыі.

У 1930-я гг. назіралася актывізацыя дзейнасці ПМШ на Палессі. У Палескім ваяводстве таварыства ў жніўні 1933 г. мела ў сваім падпарадкаванні 37 гурткоў (1 215 чалавек). Таксама яно ўтрымлівала гімназію, 19 пачатковых школ, 2 рамесніцкія школы (у Пружанах і Пінску), 3 двухгадовыя кравецкія і шавецкія курсы, інтэрнат і краму канцтавараў[15]. На ваяводскім з'ездзе ў кастрычніку 1934 г. у Пінску сярод галоўных задач адзначалася адкрыццё польскіх пачатковых школ у палескіх «бясшкольных акругах». Колькасць пачатковых школ таварыства ўзрасла з 13 у 1931/32 навучальным годзе да 115 у 1938/39[16]. У асноўным гэта былі прыватныя школы 1-й ступені. Звычайна ў такіх 4-класных школах працаваў адзін настаўнік.

[12] Rolecki R. Czudzin wieś powiatu łuninieckiego… S. 209—210.

[13] Statut Towarzystwa Polskiej Macierzy Szkolnej. Warszawa, 1922. S. 3.

[14] Polska Macierz Szkolna na Polesiu. Warszawa, 1939. S. 24.

[15] ДАБВ. Ф. 1, воп. 9, спр. 1442, арк. 24.

[16] Polska Macierz Szkolna... S. 36.

Як ні дзіўна, мясцовыя адміністрацыйныя ўлады пільна сачылі за гурткамі ПМШ. Адносна створанага яшчэ ў маі 1926 г. гуртка ПМШ у Пружанах адміністрацыйныя ўлады дакладвалі Палескаму ваяводскаму ўпраўленню, што «мэта і меркаваная дзейнасць таварыства з пункту гледжання інтарэсаў дзяржавы з'яўляюцца вельмі карыснымі»[17]. Аднак на Палессі сярод членаў гурткоў ПМШ былі асобы, якія пераважна мелі палітычныя сімпатыі да польскіх хрысціянскіх дэмакратаў (хадэкаў) і нацыянальных дэмакратаў (эндэкаў) (г. зн. былі апазіцыйна настроеныя да кіруючага лагера пілсудчыкаў), хоць у склад упраў маглі ўваходзіць людзі і з праўрадавымі поглядамі. Польскія ўлады зрабілі «адпаведныя» захады, скіраваныя на іх кадравае і ідэалагічнае ўмацаванне. Як адзначала ў лютым 1934 г. Палескае ваяводскае ўпраўленне ў сваёй справаздачы ў МУС Польшчы, у ваяводскай і акруговых управах у Брэсце і Пінску «праведзена пэўная персанальная селекцыя, у выніку якой з іх былі выдалены асобы, што выразна заяўлялі пра сваю прыналежнасць да эндэкаў». Палескую ваяводскую ўправу ПМШ узначалілі пінскі каталіцкі біскуп К. Букраба і дэпутат сейма Э. Дунін-Маркевіч, акруговую ўправу ў Брэсце — інжынер Я. Радзікоўскі («апалітычны, лаяльна выконвае дырэктывы ўладаў») і дырэктар жаночай гімназіі ПМШ С. Хадкоўскі, акруговую ўправу ў Пінску — былы дэпутат сейма, прэзідэнт горада П. Алявінскі і ксёндз Ф. Шчарбіцкі[18].

На мясцовым узроўні асноўны аб'ём культурна-асветніцкай працы выконвалі настаўнікі, з якімі гурткі ПМШ заключалі дамовы. Настаўнік абавязваўся вучыць не толькі дзяцей у школах, але і дарослых непісьменных на спецыяльных курсах, а таксама ствараць мясцовы культурны асяродак. Настаўнік, такім чынам, фактычна выконваў функцыі культасветработніка, бо яму даводзілася быць не толькі педагогам і кіраўніком школы, але і бібліятэкарам ды арганізатарам разнастайных мерапрыемстваў. Матэрыяльнае заахвочванне настаўнікаў школ ПМШ было меншым, чым у іх калег з дзяржаўных польскіх школ. Саюз польскіх настаўнікаў справядліва папракаў кіраўніцтва ПМШ у слабым матэрыяльным забеспячэнні настаўнікаў. Аднак усе прэтэнзіі былі адхілены, а сам Саюз польскіх настаўнікаў у выніку быў абвінавачаны ў антырэлігійнай і камуністычнай дзейнасці. На месцах працу настаўнікаў аплачвалі ў тым ліку мясцовыя асаднікі, робячы гэта як грашыма, так і натурай (збожжам, тлушчам і інш.). Увесь прапагандысцкі апарат прадстаўляў культурна-асветніцкую дзейнасць польскіх настаўнікаў у якасці

[17] ДАБВ. Ф. 1, воп. 9, спр. 7, арк. 10.

[18] Тамсама. Спр. 1442, арк. 25 адв.

місіянерскай і цывілізатарскай. Таму кіраўніцтва ПМШ асаблівую ўвагу надавала падбору настаўніцкіх кадраў. У друку выказваліся меркаванні, каб туды пасылаліся найлепшыя людзі, а не «забракаваныя» ў цэнтральных і заходніх ваяводствах Польшчы.

Супраць паланізацыі школьнай сістэмы выступалі перш за ўсё беларускія і ўкраінскія культурна-асветніцкія арганізацыі, якія дзейнічалі на Палессі. Наяўнасць добра закансціраванай сеткі мясцовых арганізацый Беларускай сялянска-работніцкай грамады дазволіла нават пасля яе разгрому разгарнуць у 1927—1932 гг. працу гурткоў Таварыства беларускай школы. У Косаве была створана акруговая ўправа ТБШ, якая ахапіла сваёй дзейнасцю Косаўскі і Пружанскі паветы.

Гурткі ТБШ ладзілі лекцыі, аматарскія пастаноўкі, вечарыны. Разгорнутая ў канцы 1929 г. кампанія па збору подпісаў аб адкрыцці беларускіх школ з-за наўмысных абмежаванняў уладаў не дала станоўчых вынікаў. ТБШ, аднак, усё ж такі здолела стварыць сетку сваіх структурных адзінак. У 1930 г. у Палескім ваяводстве дзейнічалі 58 гурткоў (1 088 сяброў), 1932 г. — адпаведна 51 (1 048)[19]. Большасць гурткоў існавала ў Косаўскім і Пружанскім паветах. Некалькі гурткоў ТБШ працавалі на Піншчыне. Рабіліся спробы адкрыць акруговую ўправу ТБШ у Пружанах, але безвынікова. Польскія ўлады не дазволілі адкрыць беларускую гімназію ў Пінску. Толькі пасля забароны акруговай управы ў Косаве спынілася культурна-асветніцкая дзейнасць ТБШ у Палескім ваяводстве. Менавіта гэтая арганізацыя разам з некалькімі гурткамі Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (апошні з іх быў закрыты ў 1931 г. у Бярозе-Картузскай) настойліва займалася беларускай культурна-асветніцкай працай сярод мясцовага насельніцтва.

Традыцыі ўкраінскага культурна-асветніцкага руху на Палессі падтрымлівала таварыства «Просвіта» (аўтаномнае ад аднайменнага таварыства, якое ўзначальвалася са Львова), што было зарэгістравана ў Брэсце ў сакавіку 1923 г. Паводле статута, мэтай арганізацыі з'яўлялася «развіццё асветы і ўздым культурнага становішча ўкраінскага насельніцтва Палесся»[20]. Таварыства адразу ж разгарнула шырокую дзейнасць: адкрыла бібліятэкі-чытальні, драмгурткі ў Брэсцкім, Кобрынскім, Сарненскім і іншых паветах, арганізавала хор, рыхтавалася да адкрыцця ў Брэсце ўкраінскай гімназіі. У 1924 г. была адкрыта ў Брэсце прыватная 7-класная ўкраінская школа.

[19] ДАБВ. Ф. 1, воп. 9, спр. 46, арк. 28; спр. 1395.

[20] Статут Українського товариства «Просвіта» на Поліссі. Brześć nad Bugiem, 1928. S. 3.

Ажыўленне ўкраінскага культурна-асветніцкага руху на Палессі моцна напалохала польскія ўлады. Сведчанне таму — вытрымка са справаздачы Палескага ваяводскага ўпраўлення аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў чэрвені 1923 г.:

> *Акцыя ўкраінскіх дзеячаў супраць польскай пачатковай школы падтрымліваецца ўкраінскім насельніцтвам, у некаторых мясцовасцях падае на добрую глебу*[21].

Наступны дакумент, справаздача Камандавання корпуса IX акругі (DOK-IX) з сядзібай у Брэсце за 1923 г., таксама пацвярджае актывізацыю дзейнасці таварыства «Просвіта»:

> *Акрамя бальшавіцкай агітацыі, на дадзенай тэрыторыі ўсё больш пашыраецца агітацыя з боку ўкраінскай арганізацыі «Просвіта» (украінскія самасційнікі), якія пад выглядам арганізацыі каапературыву аб'ядноўваюцца ў розных месцах тутэйшай акругі… Гэты рух больш небяспечны, чым бальшавізм, бо яго кіраўнікамі з'яўляюцца людзі інтэлігентныя, пераважна з вышэйшай адукацыяй. […] Чым далей на поўдзень, тым мацней дзейнасць «Просвіты»*[22].

Утворанае ў кастрычніку 1926 г. Украінскае сялянска-рабочае сацыялістычнае аб'яднанне (Сельроб) таксама настойліва выступала ў абарону нацыянальных правоў украінскага насельніцтва. Сельроб паступовa стварыў сетку гурткоў у Брэсцкім, Кобрынскім, Драгічынскім, Пінскім, Столінскім, Камень-Кашырскім і Сарненскім паветах Палескага ваяводства. Актывісты Сельроба актыўна выкарыстоўвалі легальныя магчымасці працы ў «Просвіце», а тыя з іх, каго выбралі ў органы мясцовага самакіравання, настойліва дабіваліся адкрыцця ўкраінскіх школ. Украінскія прадстаўнікі ў магістраце Брэста ў прынятай 24 сакавіка 1927 г. дэкларацыі заявілі, што будуць змагацца «з усімі праявамі дэнацыяналізацыі ўкраінскага насельніцтва, асабліва ў школьным і пазашкольным выхаванні»[23].

У сваю чаргу, гэта дазволіла «Просвіце» стварыць уласную сетку гурткоў (у 1928 г. іх налічвалася 112 (1 601 чалавек), у 1929 г. — 127 (1 754 чалавекі)) у Брэсцкім, Кобрынскім, Драгічынскім, Пінскім, Столінскім і

[21] ДАБВ. Ф. 67, воп. 1, спр. 364, арк. 27.

[22] Тамсама. Спр. 17, арк. 25.

[23] Наше життя. 1927. 8 травня.

Пружанскім паветах[24]. Эфектыўна працавалі павятовыя ўправы ў Брэсце і Кобрыне. У Брэсце былі арганізаваны агульнаадукацыйныя і кааператыўныя курсы. Актывісты-ўкраінцы стваралі на месцах кааператывы і цэнтры нацыянальнай культуры («Рідна хата»). Самадзейныя мастацкія калектывы ладзілі тэатральныя пастаноўкі. Да пачатку 1929 г. удалося адкрыць 127 бібліятэк-чытальняў «Просвіты».

Рэпрэсіі з боку польскіх уладаў падрывалі сілы «Просвіты». У 1930 г. ацалелі толькі 79 гурткоў (1 534 чалавекі), у наступным годзе — 56 (1 031 чалавек)[25]. Пазіцыі гэтай легальнай культурна-асветніцкай арганізацыі таксама аслабляліся палітычным экстрэмізмам дзеячаў КПЗБ. Пад ціскам польскай паліцыі кіраўнік «Просвіты» на Палессі А. Базылевіч 1 чэрвеня 1932 г. закрыў 30 бібліятэк-чытальняў як «ачагі камунізму». У 1933 г. былі ліквідаваныя ўсе вясковыя бібліятэкі-чытальні «Просвіты» — засталася толькі адна ў Брэсце. Такі ж лёс напаткаў і гурткі арганізацыі — іх засталося толькі два. Фактычна з гэтага часу «Просвіта» ў Палескім ваяводстве прыйшла ў заняпад. Крытычным заставалася і становішча адзінай украінскай школы ў Брэсце.

Абмежаванні і праследаванні ў галіне адукацыі адчула і руская меншасць на Палессі. У 1921 г. у Брэсце намаганнямі мясцовага аддзялення Рускага дабрачыннага таварыства (РДТ) была адкрыта руская гімназія. Як згадваў яе выпускнік М. Мантвілаў, руская пачатковая школа і гімназія аказаліся безабароннымі перад самавольствам польскіх уладаў. У 1928/29 навучальным годзе школьныя чыноўнікі запатрабавалі ад гімназіі пад пагрозай яе закрыцця займець уласны будынак. Дзякуючы маральнай і матэрыяльнай падтрымцы РДТ, мясцовага рускага насельніцтва і праваслаўнай брацкай царквы, якая дала бясплатна ўчастак зямлі, новы будынак гімназіі быў узведзены летам 1930 г.[26].

Аддзел РДТ у Пінску, які ўзнік у 1925 г., займаўся ўтрыманнем 7-класнай рэальнай гімназіі і падтрымкай рускіх эмігрантаў. На чале аддзела стаў інжынер М. Катовіч. Пасля пераезду М. Катовіча з Пінска ў Брэст старшынёй аддзела РДТ у Пінску стала памешчыца Вольга Смалянская[27].

Рускае рэальнае вучылішча (гімназія) у Пінску было адкрыта ў 1921 г. і на працягу ўсяго перыяду свайго існавання знаходзілася пад

[24] ДАБВ. Ф. 1, воп. 9, спр. 46, арк. 69.

[25] Тамсама.

[26] Монтвилов М. В. Русская гимназия в Бресте на Буге, 1919—1939. Ним—Брест—Минск, 1996. С. 32, 33.

[27] ДАБВ. Ф. 114, воп. 1, спр. 1а, арк. 2.

апекай праваслаўнага святара Уладзіміра Сарашкевіча, а таксама аддзела РДТ. Першым яго дырэктарам быў Дзмітрый Георгіеўскі, які потым стаў захавальнікам Палескага музея. Пазней дырэктарам стаў А. Фёдараў. Вучылішча атрымлівала матэрыяльную дапамогу ад мясцовай рускай інтэлігенцыі, служачых, памешчыкаў. Гэтая навучальная ўстанова карысталася вялікай папулярнасцю сярод жыхароў Пінска і яго ваколіцаў, бо тут была ўмераная плата за навучанне, выкладаліся прадметы матэматычна-тэхнічнага профілю, праводзілася добра наладжанае культурна-эстэтычнае выхаванне. У 1928 г. вучылішча было закрыта нібыта за актыўнае правядзенне «русіфікатарскай палітыкі». Паводле ацэнак польскіх уладаў, гімназія «прывівала вучням нянавісць да Польшчы» і з'яўлялася «ачагом рускага шавінізму», дзе вучням загадвалі чытаць творы Пятра Краснова і Кацярыны Брэшка-Брэшкоўскай, а таксама гераізавалі Барыса Каверду, які зрабіў 7 чэрвеня 1927 г. у Варшаве замах на савецкага пасла Пятра Войкава[28].

Руская гімназія ў Брэсце з'яўлялася своеасаблівым нацыянальна-культурным цэнтрам. У гімназіі працавалі літаратурны, гістарычны, фізічны гурткі, гурток прыродазнаўства «Зялёныя сябры», аматараў-фатографаў. Гімназісты мелі сваю скаўцкую арганізацыю, займаліся мастацкай самадзейнасцю, выдавалі часопіс «Проблески». У 1935/36 навучальным годзе ў яе 6 класах вучыўся 141 вучань. Усяго ж у 1921—1939 гг. у рускай гімназіі і пачатковай школе ў Брэсце вучыліся 8—8,5 тыс. чалавек[29].

Прыватны тып установаў адукацыі знаходзіўся пераважна ў руках яўрэйскай нацыянальнай меншасці. У 1921 г. у Палескім ваяводстве было 32 прыватныя школы, што складала 8,9% ад агульнай колькасці школ[30]. Да 1926 г. колькасць прыватных школ узрасла да 61[31]. У 1928 г. іх было 65, з іх 7 — з польскай мовай выкладання, 8 — з польскай мовай, дзе старажытнаяўрэйская мова (іўрыт) вывучалася як прадмет, 18 — з выкладаннем на іўрыце, 13 — на ідыш, 10 — з выкладаннем на ідыш (польская мова і іўрыт — прадметы), 2 — з вучобай на іўрыце (ідыш — прадмет), 5 — з выкладаннем па-польску (іўрыт і ідыш — прадметы), 2 — з выкладаннем па-руску, дзе вывучалі польскую і ўкраінскую мовы[32]. Да 1937 г. колькасць прыватных школ у Палескім ваяводстве дасягнула

[28] ДАБВ. Ф. 1, воп. 10, спр. 909, арк. 43.

[29] Монтвилов М. В. Русская гимназия в Бресте на Буге… С. 55, 76.

[30] Rocznik Poleski. Brześć nad Bugiem, 1927. S. 122.

[31] ДАБВ. Ф. 59, воп. 1, спр. 314, арк. 47.

[32] Тамсама. Воп. 8, спр. 146, арк. 7.

166 (12,5% ад агульнай колькасці)[33]. Безумоўна, яны не маглі цалкам задаволіць адукацыйныя патрэбы мясцовых жыхароў.

Як сведчаць звесткі за 1924/1925 навучальны год, 52,5% яўрэйскіх дзяцей у Палескім ваяводстве займаліся ў прыватных яўрэйскіх школах (па ўсёй Польшчы — толькі 17,8%). Да 1934/35 навучальнага года гэтыя паказчыкі складалі адпаведна 42,3% і 19,2%[34]. Такая дыспрапорцыя тлумачыцца тым, што польскія ўлады не змаглі забяспечыць дадзеную тэрыторыю разгалінаванай сеткай дзяржаўных школ, таму прыватныя яўрэйскія школы кампенсавалі агульны недахоп адукацыйных устаноў. Па стане на 1 снежня 1927 г. у 7 паветах Палескага ваяводства дзейнічалі 42 прыватныя школы, з іх 45% складалі школы з выкладаннем на старажытнаяўрэйскай мове (пераважна таварыства «Тарбут»), 33% — школы з мовай навучання ідыш. У Брэсце былі адкрытыя прафесійныя школы арганізацыі ORT (Арганізацыі развіцця прамысловай, рамесніцкай і сельскагаспадарчай творчасці) з 5 аддзяленнямі (сталярным, слясарным, механічным, жаночых краўцоў, цырульнікаў).

Утворанае ў 1921 г. «Аб'яднанне яўрэйскіх школ» займалася пачатковымі і сярэднімі школамі для яўрэйскіх дзяцей на іўрыце. У Пінску і іншых гарадах пачалі стварацца аддзяленні яўрэйскага культурна-асветніцкага таварыства «Тарбут». З 1922 г. у Пінску існавала яўрэйская прыватная гімназія з выкладаннем на іўрыце. Там жа былі адкрытыя дзве 7-класныя школы, куды прымалі яўрэйскіх дзяцей 7—8-гадовага ўзросту. У 1934 г. у Палескім ваяводстве налічвалася яшчэ 28 пачатковых школ з выкладаннем на іўрыце, а таксама 9 дзіцячых садкоў[35].

Акрамя агульнаадукацыйных школ, дзейнічалі таксама яўрэйскія рэлігійныя школы — хедары, талмуд-торы, школы «Бет-Якаў» для дзяўчат і ешыботы для хлопцаў. У Пінску з 5 яўрэйскіх рэлігійных школ былі 2 талмуд-торы — 2-класная, дзе штогод вучылася да 200 вучняў (пры ёй у 1930 г. была адкрыта 3-класная рэлігійная школа «Bejs Jaków» («Бет-Якаў») і 4-класная для хлопцаў, дзе было больш 120 вучняў, а таксама школа «Tuszia» («Тушыя»), 8-класная рэлігійная школа культурна-асветніцкага таварыства «Chorew» («Хорэў»), якому падпарадкоўваліся ўсе талмуд-торы ў Польшчы[36].

[33] Polski stan posiadania na Polesiu... S. 34.

[34] Chmielewski S. Stan szkolnictwa wśród Żydów w Polsce // Sprawy Narodowościowe. 1937. № 1—2. S. 32—74.

[35] Dachówna D. Szkolnictwo hebrajskie w Polsce // Sprawy Narodowościowe. 1935. № 3—4. S. 259.

[36] ДАБВ. Ф. 59, воп. 2, спр. 703, арк. 3; спр. 623, арк. 1; спр. 652, арк. 2.

Становішча яўрэйскіх прыватных школ было складаным. Утрымліваліся яны за кошт платы за вучобу, невялікіх субсідый магістрата і ахвяраванняў яўрэйскага насельніцтва. Нярэдка навучанне праводзілася ў непрыстасаваных памяшканнях. Адчуваўся недахоп падручнікаў.

У адукацыйных установах «Тарбут» старажытнаяўрэйская мова з'яўлялася мовай выкладання ўсіх прадметаў, акрамя польскай мовы і гісторыі. Гімназія «Тарбут», што была заснавана ў Пінску ў 1922 г. яшчэ як 4-класная сярэдняя школа, а ў 1926 г. атрымала статус гімназіі, мела прыродазнаўча-матэматычны профіль і была даступнай пераважна для маёмасных пластоў яўрэйскай супольнасці горада. У першы год навучання там было 425 чалавек[37]. У 1—4 класах вучні вывучалі асновы іўрыта, яўрэйскую гісторыю, сусветную гісторыю, польскую мову, лацінскую мову, арыфметыку, геаграфію, батаніку, асновы хіміі. У 5—7 класах вывучалі сусветную, а потым і яўрэйскую літаратуру, у 8 класе — філасофію, сацыялогію, псіхалогію[38]. У 1927 г. у гімназіі «Тарбут» для большасці вучняў была зменшана плата за навучанне — ад 15 да 90%[39]. Сярод выкладчыкаў былі вопытныя кваліфікаваныя педагагічныя работнікі. Пасля эміграцыі ў Палесціну дырэктара гімназіі Абрама Мазура яго пасаду з 1931 г. заняў аўтарытэтны, высокакваліфікаваны настаўнік Давід Альпер, які працаваў з 1923 г. у гімназіі інспектарам і настаўнікам[40]. У 1936 г. у гімназіі «Тарбут» у Пінску налічвалася 2 587 вучняў, у яе бібліятэцы было 4,5 тыс. кніг[41]. З 1937/38 навучальнага года пры гімназіі пачаў дзейнічаць гуманітарна-прыродазнаўчы ліцэй. Пінская гімназія «Тарбут» карысталася добрай рэпутацыяй сярод яўрэяў усёй Польшчы. З усіх гімназій «Тарбут» у Польшчы толькі сярэднія школы ў Пінску і Беластоку атрымалі правы публічнасці.

Яўрэйская 7-класная пачатковая школа «Мідраш-Тарбут» (*Midrasz-Tarbut*) была створана ў Пінску ў 1925 г. Туды прымалі на вучобу з 7—8 гадоў. Школа размяшчалася ў 7 прыватных будынках. У верасні 1927 г. там налічвалася 226 вучняў, большасць якіх (88%) паходзіла з незаможных сацыяльных пластоў — рамеснікаў, рабочых, дробных гандляроў, інтэлігенцыі. Для 40% была зніжана плата за вучобу. Дэфі-

[37] ДАБВ. Ф. 59, воп. 2, спр. 703, арк. 16; Sprawy Narodowościowe. 1936. № 6. S. 646.

[38] Gisenstejn M. Jewish schools in Poland 1919—1939. New York, 1950. P. 44—46.

[39] ДАБВ. Ф. 59, воп. 2, спр. 1097, арк. 19, 23.

[40] Эліасберг Я. Успаміны і сустрэчы // Спадчына. 1996. № 4. С. 205; Sołomian-Łoc F. Getto i gwiazdy. Warszawa, 1995. S. 47.

[41] Gisenstejn M. Jewish schools in Poland… P. 96; Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej: informator / Red. B. Bieńkowska. Poznań, 1998. S. 457.

цыт школьнага бюджэту быў вялікім: у 1925/26 навучальным годзе — 4,8 тыс. злотых, у 1926/27 навучальным годзе — 6,83 тыс. злотых. Нягледзячы на гэта, магістрат не задаволіў просьбы аб выдзяленні субсідый[42]. У школе «Мідраш-Тарбут» у 1934 г. навучалася 609 дзяцей. У 1936 г. бацькі дзяцей купілі для школы 360 кніг[43].

Выдаткі на асвету займалі значнае месца ў гадавым бюджэце яўрэйскіх кагалаў. У крызісныя перыяды, аднак, кагалы звярталіся за падтрымкай да шырокай яўрэйскай грамадскасці. У 1924 г. на сходзе членаў Таварыства аб'яднаных яўрэйскіх школ у Брэсце было вырашана для выратавання нацыянальнай асветы звярнуцца да працоўных горада ахвяраваць палову дзённага заробку, а гандляроў і рамеснікаў — 5 злотых[44].

Да канца 1930-х гг. таварыства «Тарбут» здолела захаваць свае пазіцыі. У 1937 г. у Палескім ваяводстве дзейнічалі 19 яго школ. Толькі ў Пінску існавалі 3 школы з выкладаннем на іўрыце, сярод іх адзначаная гімназія «Тарбут» на чале з Давідам Альперам, 7-класная школа пры гэтай гімназіі, а таксама 6-класная школа «Мідраш-Тарбут» (дырэктар — Лейб Канат)[45]. Там жа дзейнічалі вячэрнія курсы для дарослых па вывучэнні іўрыта, адкрытыя таварыствам «Тарбут» у 1935 г. Іх праграма была нацэлена на падрыхтоўку да эміграцыі ў Палесціну. На працягу 2-х гадоў вывучаліся іўрыт, гісторыя яўрэйскай і сусветнай культуры. Наступны лёс яўрэйскіх настаўнікаў гэтых школ, як і наогул яўрэйскай супольнасці, быў трагічным. Давід Альпер быў расстраляны нямецкімі акупантамі яшчэ ў пачатку жніўня 1941 г., а яго сям'я загінула падчас ліквідацыі пінскага гета ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада 1942 г.[46].

Ацэньваючы зробленае польскімі ўладамі ў галіне адукацыі на Палессі (асабліва ў 1930-я гг.), трэба прызнаць, што яны не здолелі істотна выправіць сітуацыю ў гэтай сферы. Пра слабое матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне школ сведчыць справаздача Таварыства развіцця ўсходніх земляў. У 1936 г. на Палессі з 236 тыс. дзяцей школьнага ўзросту толькі 183 тыс. вучыліся, астатнія (23%) не былі ахопленыя школьным навучаннем. З тых, што хадзілі ў школу, каля 50% вучыліся ў не адпаведных для вучобы умовах, бо адсутнічала дастатковая колькасць педагогаў, не

[42] ДАБВ. Ф. 2005, воп. 1, спр. 133, арк. 48, 51.

[43] Тамсама. Ф. 310, воп. 3, спр. 139, арк. 58.

[44] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). Ф. 662, воп. 3, спр. 6, арк. 243.

[45] ДАБВ. Ф. 59, воп. 2, спр. 1097, арк. 19, 23; спр. 1133, арк. 62; спр. 1271, арк. 16; воп. 4, спр. 1524, арк. 35—38; Sprawy Narodowościowe. 1936. № 6. S. 646.

[46] Розенблат Е., Еленская И. Пинские евреи, 1939—1944 гг. Брест, 1997. С. 77.

хапала школьных будынкаў і жылля для настаўнікаў. З 1 200 будынкаў 820 былі арандаванымі. Больш за 200 будынкаў мелі ўмовы, якія не адпавядалі элементарным патрабаванням.

Дрэнным было становішча прафесійнай адукацыі. У 1935/36 навучальным годзе ў Брэсцкай школьнай акрузе дзейнічалі 25 прафесійных школ (2 444 навучэнцы), з іх большасць — прыватныя (заснаваныя грамадскімі арганізацыямі і прыватнымі асобамі). Толькі 4 сельскагаспадарчыя школы мелі дзяржаўны статус. Гэтаму тыпу навучальных устаноў таксама былі слаба забяспечаныя адпаведныя ўмовы для дзейнасці.

Як адзначалася ў згаданай справаздачы, без фінансавай падтрымкі дзяржавы ні гміны, ні Таварыства дапамогі будаўніцтву грамадскіх пачатковых школ не маглі тады карэнным чынам выправіць становішча:

> *Пры далейшым падтрыманні цяперашняга тэмпу інвестыцый Палескае ваяводства толькі праз 140 гадоў […] дасягне цяперашняй гушчыні брукаваных дарог Варшаўскага ваяводства*[47].

Сцвярджалася, што ўкладанне інвестыцый у заходнепалескі рэгіён мае не толькі сацыяльна-эканамічнае, але і палітычнае значэнне:

> *Жыхары Палесся ў пераважнай масе (63%) не ўсведамляюць сябе нацыянальна, не адчуваюць сябе ні ўкраінцамі, ні беларусамі, застаючыся палешукамі, г. зв. «тутэйшымі»... Каб паляшук не паддаваўся падрыўным антыдзяржаўным уплывам, не ўкраінізаваўся ці беларусізаваўся, мы павінны яго звязаць з дзяржавай матэрыяльнымі і духоўнымі повязямі, мусім стварыць адпаведныя ўмовы гаспадарчага і культурнага быцця, задаволіць мінімальныя патрэбы, магчымасць навучання дзяцей у польскай школе*[48].

Мясцовую адміністрацыю і польскія ўрады не задавальнялі тэмпы нацыянальна-культурнай асіміляцыі Палесся. Паводле вынікаў перапісу насельніцтва 1931 г., усяго ў Палескім ваяводстве было адзначана 166 332 чалавекі, роднай мовай якіх паказана польская (14,7%)[49]. Адначасова больш за 707 тыс. чалавек былі зафіксаваныя «тутэйшымі» (68,2% насельніцтва)[50]. Менавіта іх разглядалі як нацыянальна несвядомых людзей, ці як тэрытарыяльна-дыялектную групу польскага этнасу:

[47] ДАБВ. Ф. 1, воп. 2, спр. 3613, арк. 22.

[48] Тамсама. Арк. 25.

[49] Тамсама. Воп. 9, спр. 2253, арк. 8; ф. 2, воп. 1, спр. 4968, арк. 79.

[50] Mironowicz E. Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku ... S. 42.

*Тэрыторыя Палесся мае каласальнае значэнне з палітычна-нацыянальнага пункту гледжання як клін паміж уплывам Беларусі і Украіны. Каланізацыя палешукоў значна паскорыць вырашэнне пытання аб народнасці ў цэлым на прасторы паўночна-ўсходніх земляў*[51].

Таму прымаліся канкрэтныя захады ў справе пашырэння паланізацыі заходнепалескага рэгіёна. Прапаноўвалася распачаць інвеставанне ў развіццё шляхоў зносін, меліярацыі, пераапрацоўкі сыравіны, а таксама асветы. Паводле распрацаванага плана пашырэння пачатковай адукацыі прадугледжвалася ў першыя 4 гады разгарнуць будаўніцтва школ і жылля для настаўнікаў. У прыватнасці, меркавалася ўзвесці школьныя будынкі дзяржаўных гімназій у Брэсце і Лунінцы:

*Дзяржаўная гімназія ў Лунінцы цяпер знаходзіцца ў 3-х чыгуначных будынках, непрыстасаваных да патрэб установы і вельмі аддаленых адзін ад другога. Адзін з будынкаў нават аддалены ад галоўнага гмаху чыгуначным пераездам*[52].

Было запланавана ўзвядзенне будынкаў педагагічных ліцэяў у Брэсце і Пінску, будынка кураратарства Брэсцкай школьнай акругі і інш.

Аднак непісьменнасць заставалася адной з вострых нявырашаных сацыяльных праблем. Тэмпы яе ліквідацыі ў Польшчы ў 1920-я гг. складалі 10%. У 1931 г. непісьменныя на Палессі складалі каля 35% (у вёсках гэты паказчык вагаўся ад 40% да 68%)[53]. Пры непарушнасці геапалітычнай сітуацыі канчатковая ліквідацыя непісьменнасці магла расцягнуцца на некалькі дзесяцігоддзяў.

Напярэдадні верасня 1939 г. у Палескім ваяводстве з 1075 пачатковых школ 1-й ступені было 811, 2-й ступені — 170, 3-й ступені — толькі 94[54]. Даволі вялікім захоўваўся працэнт адсеву. З-за дрэннага здароўя, аддаленасці школ, неабходнасці дапамагаць бацькам па гаспадарцы, матэрыяльнай незаможнасці і іншых прычын у часткі вучняў былі дрэнныя вынікі вучобы. Няпольскіх навучальных устаноў фактычна былі толькі адзінкі.

У лісце, накіраваным у лютым 1937 г. у МУС Польшчы, Палескае ваяводскае ўпраўленне прапанавала шэраг захадаў, у тым ліку ў галіне адукацыі:

[51] Polski stan posiadania na Polesiu… S. 21.

[52] ДАБВ. Ф. 1, воп. 2, спр. 3613, арк. 8.

[53] Polski stan posiadania na Polesiu. S. 32.

[54] ДАБВ. Ф. 59, воп. 2, спр. 657, арк. 3—4.

> *У бліжэйшыя гады лічым неабходным: 1) поўнасцю ажыццявіць ліквідацыю «бясшкольных раёнаў» на Палессі; 2) прыстасаваць ужо існуючыя школьныя будынкі, што не адпавядаюць сваймy прызначэнню, да неабходных патрабаванняў; 3) палепшыць жыллёвыя ўмовы і забеспячэнне вясковых настаўнікаў; 4) атрымаць ад дзяржавы доўгатэрміновы крэдыт (на 5 гадоў) на драўніну для будаўніцтва школ.* […] *Настаўнік у палескай вёсцы ёсць такім фактарам, які мае, напэўна, самы большы ўплыў не толькі на школьную, але і старэйшую моладзь, а таксама на іх бацькоў.* […] *Настаўніцкія сілы для палескай вёскі павінны быць старанна падабраныя сярод элементаў польскага ядра, з ідэалагічнай настроенасцю, якія маюць пачуццё важнасці місіі, якую трэба тут выканаць. Не можа быць і гаворкі, прынамсі на працягу 10 найбліжэйшых гадоў, каб настаўнікам на Палессі мог быць рускі, украінец, беларус ці нават мясцовы паляшук. Настаўнік-паляшук праваслаўнага веравызнання найчасцей падпадае пад русіфікацыю ці нават украінізацыю і замест актыўнай дзейнасці ў інтарэсах дзяржавы сам падпадае пад уплыў пасіўнага асяроддзя альбо нават варожага польскім уладам.* […] *Палессе становіцца зручнай тэрыторыяй для гарадской каланізацыі. Сучасныя палескія гарады і мястэчкі заселеныя* […] *пераважна яўрэйскім элементам і значным працэнтам рускіх і русіфікаваных палешукоў. Польскі элемент у гарадах і мястэчках — гэта амаль выключна чыноўнікі і дзяржаўныя служачыя*[55].

У лісце былі закрануты таксама праблемы парцэляцыі, асадніцтва, каланізацыі. Для правядзення культурна-асветніцкай працы сярод засцянковай шляхты прапаноўвалася прыцягнуць такія польскія грамадскія арганізацыі, як Стралецкі саюз, Саюз маладой вёскі, Саюз рэзервістаў[56]. Патрабавалася перагледзець усю дзяржаўную кадравую палітыку («прысылаць кваліфікаваныя, маральныя кадры»).

У падрыхтаванай ваяводскім упраўленнем у маі 1939 г. запісцы «Польскі стан валодання на Палессі» быў прапанаваны комплекс захадаў па ўзмацненні польскага ўплыву ў сацыяльна-эканамічным, нацыянальна-культурным і канфесійным жыцці[57]. Асаблівы акцэнт рабіўся на захады па нацыянальна-культурнай асіміляцыі насельніцтва:

[55] ДАБВ. Ф. 1, воп. 8, спр. 1656, арк. 14—19.

[56] Тамсама. Арк. 18, 20.

[57] Polski stan posiadania na Polesiu. S. 81—110.

змяненне законаў 1924 г. для скасавання права аб магчымасці выкарыстання беларускай і ўкраінскай моў у адукацыі; закрыццё прыватнай рускай гімназіі і пачатковай школы ў Брэсце; недапушчэнне дзейнасці ўкраінскіх, беларускіх, рускіх арганізацый на тэрыторыі ваяводства; выдаленне чыноўнікаў дзяржаўных органаў, настаўнікаў, служачых грамадскіх устаноў няпольскай прыналежнасці і замена іх выключна палякамі ці паланізаванымі палешукамі. Выказваліся прапановы па фінансавай падтрымцы будаўніцтва сеткі пачатковых школ, асабліва ў «бясшкольных акругах», адкрыццю новых ніжэйшых прафесійных школ, пашырэнню сеткі бібліятэк, народных дамоў і г. д. Аднак пачатак Другой сусветнай вайны перашкодзіў рэалізацыі дадзенага праекта.

У цэлым на стан адукацыі ў Палескім ваяводстве ў складзе міжваеннай Польшчы паўплываў цэлы шэраг фактараў. Па-першае, адчуваліся дрэнныя «стартавыя пазіцыі» — слабы ўзровень цывілізацыйнага развіцця Палесся яшчэ ў складзе Расійскай імперыі, значныя страты ў гады Першай сусветнай і савецка-польскай войнаў. Па-другое, вырашэнне пытанняў асветы абцяжарвалася фінансавымі, матэрыяльна-тэхнічнымі і арганізацыйнымі цяжкасцямі, асабліва пад уздзеяннем сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гг., цесна ўвязвалася з каланізацыяй Палесся, уніфікацыяй яго ў межах польскай дзяржавы. Па-трэцяе, адукацыя стала важным палітыка-ідэалагічным інструментам у дзейнасці польскіх уладаў, што разыходзілася з інтарэсамі ўсіх мясцовых нацыянальных супольнасцяў, акрамя палякаў. Па-чацвёртае, спробы рэалізацыі праектаў нацыянальных школ (найперш беларускіх, украінскіх, рускіх, у меншай ступені яўрэйскіх) выклікалі пазіцыю непрымання іх і пераследу з боку польскіх уладаў, якія аказвалі садзеянне толькі польскамоўнай асвеце.